**23.** Дадзены словы са значэннем прыкметы па прыналежнасці. Знайдзіце памылкова ўтвораныя прыметнікі.

*1) вавёрчан; 2) гусіны; 3) змяяны; 4) мядзвяджы; 5) сарочы; 6) лісіны.*

**А)** 1, 3, 5; **Б)** 1, 3, 4; **В)** 2, 5, 6; **Г)** 2, 4, 6; **Д)** 3, 4, 5.

**24.** Выберыце з прыведзеных словазлучэнняў сінонімы да слова ***неруш***.

*1) няввораная зямля; 2) абмеркаванне твора; 3) гучная прамова; 4) дзікі лес; 5) грыбное месца; 6) знаёмая гульня.*

**А)** 1, 4, 5; **Б)** 1, 3, 6; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 3, 4, 5; **Д)** 1, 5, 6.

**25.** Якога слова не хапае ў сказе "*Паднімаючыся ад зямлі, сіняя густая … тушыла на небе ліловую яснасць*" (А.Асіпенка)?

**А)** хмара; **Б)** каламуць; **В)** смуга; **Г)** вада; **Д)** посцілка.

**26.** Вызначце старажытныя назвы галаўных убораў:

*1) гарсэт; 2) каптур; 3) скуфейка; 4) сфалерыт; 5) андарак; 6) магерка.*

**А)** 1, 2, 5; **Б)** 2, 3, 4; **В)** 2, 3, 6; **Г)** 3, 4, 5; **Д)** 1, 2, 6.

**27.** Які сэнс мае фразеалагічны зварот "чорная хата"?

**А)** абгарэлы будынак; **Б)** гасцінны пакой; **В)** спальня;
**Г)** кухня; **Д)** веранда.

**28.** З-за якой памылкі ў праграме для вылічальнай машыны ў 1962 годзе была ліквідавана касмічная ракета?

**А)** пунктуацыйнай; **Б)** арфаграфічнай; **В)** граматычнай;
**Г)** моўнай; **Д)** памылкі ў праграме не было.

**29.** Які раздзел мовазнаўства вывучае ўласныя імёны?

**А)** акцэнталогія; **Б)** графіка; **В)** лексікалогія;
**Г)** анамастыка; **Д)** дыялекталогія.

**30.** Хто стварыў штучную міжнародную мову эсперанта?

**А)** Стафан Баторыя; **Б)** Альбрэхт Дзюрэр;
**В)** Людвік Лазар Заменгаф; **Г)** Генрых Хрыстафоравіч Татур;
**Д)** Іаахім Ігнацый Юзаф Літавор Храптовіч.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА («Буслік»).*
*тэл. (017) 232 80 31, 239 91 72; e-mail: kenguru_belarus@mail.ru*
*http://bak.academy.edu.by*

# Конкурс па беларускай мове
# "БУСЛІК-2005"

*Чацвер, 20 студзеня 2005 года*

## Заданне для вучняў 6-7 класаў

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна адказалі на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

**1.** Са старажытных пісьмовых помнікаў вядома, што кожны горад здаўна меў свой герб. Які сімвал адлюстраваны на гербе Мінска?

**А)** рысь; **Б)** трохмачтавы карабель;
**В)** залатая пчала; **Г)** сярэбраны лук са стралой;
**Д)** жаночая постаць паміж двума анёламі.

**2.** Колькі разоў паўтараецца гук [р] у сказе *"рыбак Рыгор рыбачыў на рацэ"*?

**А)** 3; **Б)** 4; **В)** 5; **Г)** 6; **Д)** 7.

**3.** Вызначце галосныя літары: *1) а; 2) й; 3) і; 4) у; 5) ў; 6) о.*

**А)** 1, 2, 4, 6; **Б)** 2, 3, 5, 6; **В)** 1, 3, 5, 6; **Г)** 1, 2, 5, 6; **Д)** 1, 3, 4, 6.

**4.** Якія словы маюць аднолькавую колькасць гукаў?

*1) хутка; 2) поўдзень; 3) насіць; 4) з'явы; 5) жыццё; 6) цікава.*

**А)** 1, 2, 5; **Б)** 2, 4, 6; **В)** 1, 3, 4; **Г)** 3, 4, 5; **Д)** 1, 4, 6.

**5.** Якія з прыведзеных слоў з'яўляюцца назоўнікамі?

*1) тры; 2) чацвёрка; 3) свой; 4) дзесьці; 5) двойка; 6) бэлька.*

**А)** 1, 3, 5; **Б)** 2, 4, 6; **В)** 3, 5, 6; **Г)** 2, 5, 6; **Д)** 2, 3, 5.

**6.** Вызначце лішняе слова на тэму "*Будоўля*":

*1) бульдозер; 2) прас; 3) падмурак; 4) грузавік; 5) цэгла.*

**А)** 1; **Б)** 2; **В)** 3; **Г)** 4; **Д)** 5.

**7.** У якіх словах напішаце мяккі знак?

*1) кас..ба; 2) дз..весце; 3)дз..мухаць; 4) дзес..ці; 5) дз..ве; 6) дз..веры.*

**А)** 1, 3, 4; **Б)** 2, 4, 5; **В)** 3, 5, 6; **Г)** 1, 4, 6; **Д)** 2, 3, 6.

**8.** Вызначце, якія з прапанаваных назоўнікаў у беларускай мове ўжываюцца ў мужчынскім родзе, а ў рускай мове – у жаночым родзе:

*1) мазоль; 2) каўнер; 3) воўк; 4) пыл; 5) цень; 6) сын; 7) стэп; 8) яблык.*

**А)** 1, 4, 5, 7; **Б)** 2, 3, 5, 6; **В)** 3, 4, 5, 7; **Г)** 1, 2, 4, 7; **Д)** 2, 3, 5, 7.

**9.** Адгадайце вершаваную загадку С. Шах:

*Таполі родная сястра,*
*з-пад нізу ліст бы з серабра,*
*Ледзь ветрык лёгкі набяжыць –*
*і чуйны ліст ужо дрыжыць.*
*Тут здагадацца і не дзіўна,*
*што дрэва гэтае …*

**А)** сасна; **Б)** рабіна; **В)** асіна; **Г)** бяроза; **Д)** ліпа.

**10.** Што аб’ядноўвае асветнікаў Беларусі Ефрасінню Полацкую, Францыска Скарыну, Сімяона Полацкага? Выберыце правільныя адказы:

*1) нарадзіліся ў Полацку;* *2) з’яўляюцца першадрукарамі;*
*3) любоў да кніг;* *4) прага да ведаў;*
*5) пачынальнікі рускай паэзіі;* *6) па іх заказу быў зроблены крыж.*

**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 3, 4; **В)** 2, 3, 5; **Г)** 2, 4, 6; **Д)** 3, 4, 5.

**11.** Расшыфруйце рэбусы і вызначце толькі птушак.




**А)** 1, 5; **Б)** 2, 6; **В)** 3, 6; **Г)** 2, 4; **Д)** 3, 5.

**12.** Дапоўніце прыказку “*менш гавары – ...*”.

**А)** хутчэй заснеш; **Б)** рана прачнешся; **В)** нічога не забудзеш;
**Г)** болей пачуеш; **Д)** больш пазяхай.

**13.** Літара ***д*** пішацца ў словах:

*1) спа..чына; 2) пераплё..чык; 3) па..чарка;*
*4) вопра..ка; 5) кары..ца; 6) разве..чык.*

**А)** 1, 3, 6; **Б)** 1, 4, 5; **В)** 2, 3, 6; **Г)** 2, 4, 5; **Д)** 3, 4, 6.

**14.** Падумайце, якія займеннікавыя звароты з прапанаваных ужываюцца толькі ў адмоўных сказах:

*1) не хто іншы, як; 2) нішто іншае не; 3) ніхто іншы не; 4) не што іншае, як.*

**А)** 1, 2; **Б)** 1, 3; **В)** 1, 4; **Г)** 2, 3; **Д)** 2, 4.

**15.** У якіх дзясловах напішацеканчатак ***-еце*** у 2-й асобе множнага ліку?

*1) вез…; 2) сп…; 3) мы…; 4) прос…; 5) се…; 6) чыта… .*

**А)** 1, 3, 5; **Б)** 2, 4, 6; **В)** 3, 4, 5; **Г)** 3, 5, 6; **Д)** 2, 5, 6.

**16.** У якіх словах ёсць марфалагічнае падваенне зычных?

*1) збожжа; 2) адданы; 3) галлё; 4) рассыпаць; 5) смецце; 6) каменны.*

**А)** 1, 2, 4; **Б)** 2, 3, 6; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 3, 4, 6; **Д)** 1, 4, 5.

**17.** Якая птушка ў некаторых мясцовасцях Беларусі мае назву “*баравік*”?

**А)** бугай; **Б)** дзяркач; **В)** чорны бусел;
**Г)** жоўтая пліска; **Д)** сойка.

**18.** Калі правільна вызначыце парадак слоў у крыжаванцы, то ў выдзеленым вертыкальным радку прачытаеце псеўданім беларускага пісьменніка Міхала Сямёнавіча Кудзелькі.

*1) Корбан; 2) Купала; 3) Танк; 4) Арлоў; 5) Бічэль.*



**А)** 2, 1, 5, 3, 4; **Б)** 3, 5, 1, 4, 2; **В)** 4, 1, 5, 3, 2;
**Г)** 5, 3, 4, 2, 1; **Д)** 5, 2, 1, 4, 3.

**19.** Ад якіх дзеясловаў нельга ўтварыць зваротныя?

*1) сустракаць; 2) жыць; 3) выдумляць; 4) глядзець; 5)шыць; 6) дзьмуць.*

**А)** 1, 3, 5; **Б)** 2, 3, 5; **В)** 3, 4, 5; **Г)** 2, 4, 6; **Д)** 3, 5, 6.

**20.** Каму з беларускіх пісьменнікаў належаць словы: *“Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы”*?

**А)** Б. Сачанку; **Б)** Я.Коласу; **В)** К. Чорнаму;
**Г)** У. Караткевічу; **Д)** І. Мележу.

**21.** Што называюць беларускім шоўкам?

**А)** атла́с; **Б)** шэрсць; **В)** пух; **Г)** лён; **Д)** каноплі.

**22.** Якое значэнне мае выраз “*на скорую руку*”?

**А)** мець многа часу; **Б)** ляжаць нерухома; **В)** многа гаварыць;
**Г)** даць штосьці другому; **Д)** паспешліва штосьці рабіць.